**АРТ-СУПОЛКА ІМЯ ТАДЭВУША РЭЙТАНА.**
**МЭТЫ. ДЗЕЙНАСЦЬ. ВЫНІКІ.**

*Юркевіч З.*

Арт-суполка створана ў пачатку 2013 г. – даследчыкам, мастаком-перформерам Змітром Юркевічам і мастаком-жывапісцам Алесем Родзіным (куратарамі фестываля эксперыментальнага мастацтва “ДАХ”).

**МЭТЫ:**

- Усебаковая папулярызацыя імені нацыянальнага героя Беларусі Тадэвуша Рэйтана (СМІ, выставы, арт-фестывалі);
- Усебаковае ўшанаванне імёнаў героя Надзвычайнага сойму Рэспублікі Абодвух Народаў – ВКЛ і Кароны Польскай 1773-1775 (наданне яго імені вуліцам гарадоў нашай краіны, усталёўка памятных дошак, помнікаў і г.д.);
- Лабіраванне ідэі неабходнасці і неадкладнасці стварэння ў родавым котлішчы Рэйтанаў (в.Грушаўка, Ляхавіцкі раен, Брэсцкая вобл.) Дзяржаўнага музэя-запаведніка Тадэвуша Рэйтана. Бо, існуе пагроза продажы сядзібы з аўкцыёна прыватнай асобе (у тым ліку і замежніку), што будзе азначаць незваротную страту гэтай перліны нашай гісторыі культуры.
- Правядзення супраць-аварыйных прац на праблемных будынках сядзібнага комплекса Рэйтанаў, а таксама на Ляхавіцкіх могілках, дзе знаходзіцца родавае пахаванне Рэйтанаў.

**ВЫНІКІ**:

- За тры гады існавання Арт-суполкі праведзены шэраг мерапрыемстваў не толькі ў Менску, але і іншых гарадах Беларусі, у тым ліку ў в. Грушаўка (сумесна з мясцовымі ўладамі). Справаздача аб некаторых праведзеных культурных імпрэзах знаходзіцца тут: http://reyten.blogspot.com.by/2015/12/2013-2015.html
- Па выніках навуковай працы ў архівах Беларусі і Польшчы абвергнуты шматлікія міфы, якімі была абкружана гісторыя роду і асоба Тадэвуша Рэйтана. Устаноўлена дата нараджэння (1740 г.), а таксама акалічнасці смерці героя, якая не была самагубчай. Зроблена яшчэ шмат важных і цікавых адкрыццяў. Упершыню распрацаваны жыццярысы іншых прадстаўнікоў роду (Дамініка і Станіслава Рэйтанаў, пляменнікаў Тадэвуша і інш.);
- Акрамя мерапрыемстваў у дзяржаўных СМІ з’явілася больш за 30 артыкулаў прадстаўнікоў Арт-суполкі, а таксама тых, хто падтрымлівае нашу дзейнасць. Няпоўны спіс знаходзіцца тут

http://reyten.blogspot.com.by/2014/12/20132014.html

- Тры гады вядзецца праца над буйным графічным шэрагам “Род Рэйтанаў. Асобы. Падзеі” (маст. Алесь Родзін, гіст. Кансульт. Зьміцер Юркевіч), які на дадзены момант налічвае калі 100 прац. Шэраг прадстаўляе найбольш цікавыя эпізоды з гісторыі роду, сваяцкія сувязі, гісторыю супрацiву трох беларускіх дэпутатаў Тадэвуша Рэйтана, Самойлы Корсака і Станіслава Багушэвіча-Мінькоўскага Першаму падзелу  Рэспублікі Абодвух Народаў). Графічны шэраг з’яўляецца ўнікальным у гісторыі не толькі беларускага , але і сусветнага мастацтва.
- Быў выраблены шэраг календароў (розных тыпаў), магнітаў і бюст Тадэвуша Рэйтана (скульптар А.Чакан). Сумесна з выдавецтвам “Галіяфы”праведзены літаратурны конкурс імя Тадэвуша Рэйтана(па выніках выдадзены альманах ТЭКСТЫ №5). А таксама выпушчаны ўласны альманах суполкі “Палясоўшчык” №1, у якім змешчаны асноўныя пытанні і адказы, датычныя гісторыі старабеларускага рыцарскага роду Рэйтанаў і асобы Тадэвуша Рэйтана. http://reyten.blogspot.com.by/2015/12/blog-post_22.html
- Тры гады вядзецца ліставанне з дзяржаўнымі ўстановамі рэспубліканскага і мясцовага ўзроўняў па пытанню ўшанавання асобы Тадэвуша Рэйтана і стварэння мемарыяльнага музэя ў Грушаўцы.
- Прадстаўнікі Арт-суполкі  бралі ўдзел у здымках дакументальнай стужкі “Тадэвуш Рэйтан. Беларускі Дон-Кіхот” (рэж. У.Бакун, АНТ), а таксама стварылі дак. стужкі “Аліна Рэйтан” і “Суботнік у Грушаўцы” (рэж. А. Ясінская)
- Дзейнасць Арт-суполкі імя Тадэвуша Рэйтана і ідэя стварэння музэя ў сядзібе Рэйтанаў знайшла падтрымку у прафесароў - А. Мальдзіса, А.Федарука, А.Несцярчука, С. Сергачова, у Р. Сітніцы (Старшыня Беларускага Саюза Мастакоў), рэжысёра Ў. Арлова і інш. гісторыкаў,знакамітых дзеячаў культуры і мастацтва Беларусі.

Кантактны адрас і сторонкі суполкі:
lefthunder@gmail.com (Зміцер Юркевіч, старшыня);
http://reyten.blogspot.com.by
www.facebook.com/Арт-суполка-імя-Тадэвуша-Рэйтана-562381497125815/
www.vk.com/club52677453